2 (199)
ЛЮТЫ
Выдаецца
са студзеня 1993 г.

Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221
ад 14 студзеня 2013 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

## НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Пачатковая школа", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**Рэдакцыйная калегія:**

Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч

Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў ЧаснОўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

**Рэдакцыйная рада:**

Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан (старшыня рады), Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Аляксандр Корзюк, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.

**Рэдакцыя:**

Намеснік галоўнага рэдактара — Наталля Матусевіч, рэдактар аддзела — Надзея Кушнер, мастацкае афармленне — Уладзімір Малахаў, вёрстка — Надзея Пяткоўская, карэктура — Людміла Шчэрба.

## ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

**САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ**

Аляксандр Каханоўскі — Эвалюцыя саслоўна-прававога становішча мяшчан Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. 5

**ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ**

Анатоль Вялікі — Мінскі адкрыты судовы працэс 1946 года над нямецка-фашысцкімі злачынцамі 14

**ГІСТАРЫЯГРАФІЯ**

Валянцін Голубеў — Агляд беларускай гістарыяграфіі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (канец XX — пачатак XXI ст.). Аграрная гісторыя 22

**ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ**

Любоў Уладыкоўская — Беларускія колеры міжкультурнага дыялогу 31



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# АРХІВІСТ. ГІСТОРЫК. ПЕДАГОГ

## *(да 60-гадовага юбілею Анатоля Фёдаравіча Вялікага)*

*29 лютага спаўняецца 60 гадоў вядомаму беларускаму гісторыку, кандыдату гістарычных навук, дацэнту, загадчыку кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Анатолю Фёдаравічу Вялікаму.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Анатоль Вялікі нарадзіўся 29 лютага 1956 г. у невялікай палесскай вёсцы Бушацін Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці ў простай сялянскай сям'і Фёдара Аляксандравіча і Праскоўі Дзмітрыеўны Вялікіх. Тут прайшлі яго першыя дзіцячыя гады. У 1963 г. у пошуках лепшага жыцця сям'я Вялікіх пераязджае на сталае месца жыхарства ў Рэчыцу, дзе бацька набыў невялікі драўляны дамок недалёка ад Дняпра. Далей жыццё сям'і было звязана з Рэчыцай. Тут у 1973 г. Анатоль скончыў сярэднюю школу № 1, потым год працаваў рабочым у Рэчыцкім дрэваапрацоўчым аб'яднанні. У 1974—1976 гг. служыў у Савецкай арміі, якая стала сапраўднай школай жыцця — навучыла самастойнасці, рашучасці, адказнасці.

Пасля арміі перад Анатолем паўстала пытанне: ці заставацца працаваць у Рэчыцы, ці вучыцца далей. Асаблівых хістанняў не было. Ён вырашыў накіравацца ў сталіцу. Анатоля вабіла не толькі гісторыя, але і замежная мова. Таму ён звярнуў увагу на спецыяльнасць гісторыя і замежная мова на гістарычным факультэце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М.Горкага. Шлях на гістарычны факультэт пралягаў праз падрыхтоўчае аддзяленне, на якім давялося вучыцца ў 1976—1977 гг. У 1977 г. пасля паспяховага заканчэння падрыхтоўчага аддзялення і паступлення на гістарычны факультэт пачынаецца яго шлях да гісторыі і ў гісторыю. Аднак да сапраўднай навукі было яшчэ далёка. Пасля заканчэння ў 1982 г. МДПІ імя М.Горкага па размеркаванні Анатоль працуе настаўнікам у Станькаўскай школе-інтэрнаце ў Дзяржынскім раёне. Там Анатоль Фёдаравіч прапрацаваў дзесяць гадоў настаўнікам, выхавацелем, намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце. Гэтыя дзесяць гадоў дазволілі спазнаць школу не толькі звонку, але і знутры, усе асалоды і прыкрасці, расчараванні і радасці работы настаўніка.

У 1992 г. Анатоль Фёдаравіч з сям'ёй пераязджае на сталае месца жыхарства ў Дзяржынск. Адбылася не толькі змена месца жыхарства, але і змена працы. У жыцці А.Ф.Вялікага ўвайшоў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, у якім ён мае гонар працаваць і якому захаваў вернасць і да цяперашняга часу. Менавіта ў архіве ён дакрануўся да гістарычнага дакумента як крыніцы, без якой не пішацца сапраўдная і аб'ектыўная гісторыя. Супрацоўнік, вядучы навуковы супрацоўнік, начальнік аддзела Нацыянальнага архіва — шляхі-сцежкі архівіста А.Ф.Вялікага.

Паралельна з гэтым ён пачынае працаваць у альма-матэр. Спачатку на кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі пад кіраўніцтвам А.А.Кавалені, а з 1998 г. стала на кафедры Новай і Навейшай гісторыі Еўропы і Амерыкі пад кіраўніцтвам Г.А.Космача, а потым на кафедры гісторыі Беларусі пад кіраўніцтвам А.М.Лютага. У маі 2015 г. адбыўся новы паварот у навуковай і навукова-педагагічнай працы, Анатоль Фёдаравіч займае пасаду загадчыка кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ імя Максіма Танка.



*Старшы сяржант Анатоль Вялікі падчас службы ў Выбаргу.* 1976 г.



*Выпускнік Анатоль Вялікі падчас размеркавання.* Сакавік 1982 г.



*Выпуск гістарычнага факультэта МДПІ імя М.Горкага.* Стаіць (чацвёрты справа) Анатоль Фёдаравіч. 1982 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ






Анатоль Вялікі ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь.




Навуковыя інтарэсы А.Вялікага канцэнтруюцца галоўным чынам на даследаванні беларуска-польскіх і польска-беларускіх міждзяржаўных, этнанацыянальных адносінаў у ХХ ст. З канца 1990-х гадоў польская праблематыка стала галоўнай у яго навуковых даследаваннях. Рэпрэсіі супраць палякаў у 1939—1941 гг., перасяленні і рэпатрыяцыя палякаў з Беларусі ў Польшчу ў 1944—1946 г. і ў 1951 гг., дзейнасць Арміі Краёвай і ўвесь комплекс праблем, звязаных з гэтай складанай і балючай для беларусаў і палякаў праблемай, гісторыя каталіцкага касцёла ў нашай краіне, палоніка ў архівах Беларусі — вось далёка не поўны пералік праблем, якія застаюцца прыярытэтнымі для яго як паланіста.

Менавіта гэтым тэмам прысвечаны яго кандыдацкая дысертацыя "Абмен насельніцтвам паміж БССР і Польшчай. 1944—1946 гг." (абаронена ў 2002 г.) і большасць (каля 130) навуковых публікацый, у тым ліку тры манаграфіі. Нястомная праца ў архівах Беларусі, Польшчы, Расійскай Федэрацыі, удзел у шматлікіх сумесных беларуска-польскіх канферэнцыях, пасяджэннях круглага стала прынесла яму прызнанне і вядомасць сярод беларускіх і польскіх даследчыкаў. У 2010 годзе Анатоль Фёдаравіч стаў лаўрэатам прэстыжнай прэміі польскага навуковага часопіса "Prsegląd Wschodni".

Сфера навуковых зацікаўленасцяў Анатоля Фёдаравіча закранае і гісторыю Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, гісторыю архіваў і архіўнай справы Беларусі.

Сябры, калегі, вучні Анатоля Фёдаравіча, выкладчыкі і студэнты гістарычнага факультэта БДПУ сардэчна віншуюць яго з 60-гадовым юбілеем і шчыра жадаюць моцнага здароўя, шчасця і новых поспехаў у выкладчыцкай і навуковай дзейнасці.

***Аляксандр Касовіч***,
*дэкан гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат гістарычных навук.*

---

*Калектыў рэдакцыі "Беларускага гістарычнага часопіса" далучаецца да віншаванняў і спадзяецца на далейшае плённае супрацоўніцтва з Анатолем Фёдаравічам, нашым сталым аўтарам і шчырым сябрам.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ